Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 ЛЮТАГА 2016 г. ПЯТНІЦА № 22 (28132) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Таблеткі «ад раку» не будзе**

СТАР. 3



**За траўму аднаго караюць усіх**

СТАР. 3



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль КАЛІНІН, віцэ-прэм'ер:**

*«Новая канцэпцыя забеспячэння бяспекі дарожнага руху з'явіцца ў Беларусі. Адным з галоўных індыкатараў дасягнення мэтаў адпаведнай канцэпцыі, зацверджанай у 2006 годзе, было скарачэнне ў 2015 годзе ў параўнанні з 2005-м колькасці загінулых у ДТЗ не менш чым на 500 чалавек. Аналіз аварыйнасці сведчыць аб устойлівым зніжэнні асноўных паказчыкаў дарожна-транспартнага траўматызму на вулічна-дарожнай сетцы краіны на працягу апошніх 10 гадоў. Калі ў 2005 годзе ў ДТЗ загінулі 1673 чалавекі, то ў 2015-м гэты паказчык скараціўся да 658. Колькасць загінулых у ДТЗ летась адпавядае ўзроўню 1968 года».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 5.02.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 21486,00 | ▼ |
| Еўра | 23798,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 280,73 | ▲ |
| Укр. грыўня | 829,58 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ЛЮТАЎСКІЯ ВІТАМІНЫ



Вы не памыліліся: у руках агародніцы сельгаспрадпрыемства «Рудакова» Віцебскага раёна Аксаны ІВАНОВАЙ — сапраўдная рукала, расліна заморская і даволі капрызная ў нашым клімаце. А ў самым халодным рэгіёне нашай краіны яе навучыліся вырошчваць у прамысловых маштабах і збіраць ураджай у разгар зімы, як і кроп, пятрушку, салату.

Фота БЕЛТА.

■ Шляхамі Скарыны

# АД ДРУКАРНІ Ў ПРАЗЕ ДА МІНСКАГА «АЛМАЗА»

## Як да нас ішлі 500-гадовыя кнігі

**Прыехаўшы ў Полацк шукаць сляды Скарыны, што і мелася стаць пачаткам гэтага праекта, я літаральна на некалькі гадзін размінулася са Скарынавымі кнігамі. Іх якраз у той дзень з Музея беларускага кнігадрукавання, дзе яны выстаўляліся амаль месяц і прыцягнулі ўвагу не толькі палачан, але і ўсёй Віцебшчыны, павезлі назад у Мінск. І Алена Шумовіч, загадчыца музея, была ў той дзень як на іголках і ўздыхнула з палёгкай толькі тады, калі калега пазваніў са сталіцы і сказаў, што кнігі дастаўлены на месца.**

Я падумала тады, што вельмі добра яе хваляванне разумею: ні больш ні менш нацыянальныя каштоўнасці пад адказнасцю былі. А яшчэ вырашыла, што трэба кнігі дагнаць і асобную публікацыю прысвяціць менавіта ім, іхняму 500-гадоваму шляху да нас, у XXI стагоддзе...

...І вось стаю ў зале, дзе шмат старажытных фаліянтаў — масіўных, у скураных пераплётах. А ў цэнтры за шклом — дзве невялікія зусім нятоўстыя кніжачкі — фарматам з палову звычайнага аркуша паперы. З намеснікам дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесем Сушам у Музеі кнігі, што на трэцім паверсе «алмаза», мы, гледзячы на гэтыя сціплыя кніжкі, разважаем услых пра тое, што такі малы іх фармат і рабіў выданні даступнымі, як і задумаў Скарына, «усяму люду паспалітаму» і па памеры, і па цане. А яшчэ — пра тое, ці не была гэта сціпласць ужо тады рысай нацыянальнага характару. («Не, гэта не сціпласць, вы паглядзіце, якія шыкоўныя гравюры, а гравюры па тым часе былі вельмі дарагой справай. Хутчэй — практычнасць: каб чалавек мог яе з сабой насіць, упадабаныя часткі пад адзін пераплёт сабраць».) Мой суразмоўца як гасцінны гаспадар паказвае мне іншыя старажытныя кнігі, што захоўваюцца ў музеі, а я ўсё аглядаюся на тыя, за шклом у цэнтры залы. Чамусьці здаецца, што ўсе астатнія экспанаты больш цьмяныя. Ці гэтыя — больш яркія. Можа, справа ў нейкай адмысловай падсветцы...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ПРАЗ АДЛЕГЛАСЦЬ І ЧАС

Іх у Беларусі дзесяць. Чатыры — «Кнігі Царстваў» — пад адным пераплётам. Ёсць яшчэ Кнігі Іова, Прамудрасці, Ісуса Сірахава, Эклезіяста, Песня Песняў. Усе — выдадзеныя паўтысячы гадоў назад у Празе. Дзеля таго, каб «люд паспаліты» чытаў слова Божае на роднай зразумелай мове.

Пытаюся ў Алеся Сушы, які ўжо не першы год займаецца тэмай скарыназнаўства: ці даехалі 500 гадоў назад тыя кнігі да «люду паспалітага»? Усё ж ад Прагі па тагачасных мерках было няблізка.

— Скарына сваіх мэтаў дасягнуў, — лічыць спадар Алесь. — Ён бачыў мэтавай аўдыторыяй свайго прадпрыемства найперш жыхароў Вялікага Княства Літоўскага, разлічваў, што яго кнігі будуць распаўсюджвацца на вялікім рынку Маскоўскай дзяржавы. Ён выдаваў кнігі не для чэшскіх ці нямецкіх чытачоў, для якіх сама кірыліца была слабазразумелай. Ні для набажэнстваў, ні для хатняга чытання такія кнігі ў заходнім свеце не былі патрэбныя.

СТАР. 13

# СМІ ПАВІННЫ КАНСАЛІДАВАЦЬ ГРАМАДСТВА

## Калегія Міністэрства інфармацыі вызначылася з задачамі на гэты год

**Сёння галоўная задача для ўсіх сродкаў масавай інфармацыі — развіццё кантэнту, пашырэнне прысутнасці ў інфармацыйным полі. На гэтым зрабіла акцэнт міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ у размове з журналістамі перад пасяджэннем калегіі. Час патрабуе ад СМІ ўмець працаваць ва ўсіх кірунках. Так, выданні, тэлеканалы павінны працаваць не толькі з газетай ці часопісам, але і са сваёй інтэрнэт-пляцоўкай — сайтам, не забываць пра аўдыторыю, якая шмат часу праводзіць у сацыяльных сетках. У наш час газета — гэта не толькі папяровая версія, а тэлеперадачу можна паглядзець не толькі па тэлевізары.**

— Тэлебачанне сёння — гэта не проста трансляцыя па тэлевізары, — адзначыла Лілія Ананіч. — Планшэт, камп'ютар, спадарожнік — гэта таксама сродкі для распаўсюджвання тэлебачання. Уменне працаваць ва ўсіх асяроддзях — тая задача, якая будзе ставіцца перад СМІ ў найбліжэйшы час.

### Большасць газет — самаакупныя

— 2015 год быў знакавым для сродкаў масавай інфармацыі, — падкрэсліла міністр інфармацыі, гаворачы пра вынікі працы галіны ў мінулым годзе. — Мы актыўна ўдзельнічалі ў рэалізацыі ўсіх праектаў. Выбарчая кампанія, якая праходзіла ў краіне, была інфармацыйна забяспечана на патрэбным узроўні. СМІ змаглі знайсці правільны тон — паказаць у поўным аб'ёме дасягненні краіны за 20 гадоў. Беларусы зрабілі свой усвядомлены выбар на карысць далейшага развіцця суверэннай, моцнай, сацыяльна арыентаванай дзяржавы.

Важнай тэмай летась стала і 70-годдзе Вялікай Перамогі — яна праходзіла лейтматывам газетных публікацый, тэле- і радыёсюжэтаў на працягу ўсяго года. У выніку многія праекты, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, былі ўдастоены высокіх дзяржаўных прэмій.

Што да эканамічных паказчыкаў, то, як заўважыла міністр, у цэлым у галіне стабільная эканоміка.

— Мы не маем запазычанасцяў ні па плацяжах у бюджэт, ні за энерганосьбіты, выплачваем заработную плату, — паведаміла яна. — Калі казаць пра друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, то ў нас вельмі добрая эканоміка. Буйныя нацыянальныя газеты — самаакупныя.

Што немалаважна, не патрабуюць дзяржаўных датацый і больш за 90 рэгіянальных выданняў, якія таксама працуюць з прыбыткам.

— Але галоўнае — не толькі эканоміка, — упэўнена Лілія Ананіч. — Галоўнае — аўдыторыя і праца з чытачом. Сёння друкаваным сродкам масавай інфармацыі трэба прыкладаць больш намаганняў у кірунку канвергенцыі кантэнту. Патрэбны не проста інтэрнэт-сайты, неабходны і праца ў сацыяльных сетках, і распрацоўка мультымедыйных праграм для падпісчыкаў.

### Даваць адпор спекуляцыям

— Ёсць шэраг напрамкаў, якія патрабуюць далейшага ўдасканалення, — адзначыла кіраўнік Міністэрства інфармацыі. — Мы ўсур'ёз аналізавалі рынак інфармацыі, якую мы атрымліваем звонку, — у нас больш за 200 замежных тэлеканалаў. Тут вельмі важна, каб мы пашыралі сваё інфармацыйнае поле і пры гэтым заставаліся канкурэнтаздольнымі і лідзіравалі па фарміраванні грамадскай думкі.

У мінулым годзе сацыялагічныя даследаванні паказалі, што беларусы давяраюць нацыянальным сродкам масавай інфармацыі. Больш за ўсё аўдыторыі належыць пакуль тэлебачанню — 60%, 40% — інтэрнэт-СМІ, 20% — газетам.

— Інфармацыйнае поле павінна дынамічна развівацца, — лічыць Лілія Ананіч. — У нас ва ўсіх адна агульная задача. Інфармацыйная прастора павінна кансалідаваць грамадства, развіваць краіну, паказваць усё, што адбываецца ў нашай краіне. Там, дзе трэба, — аргументавана даваць адпор усім выдумкам, спекуляцыям. Упэўнена, што кадравы патэнцыял нашай галіны; тыя намаганні, якія прыкладае дзяржава ў развіцці нацыянальных сродкаў масавай інфармацыі; адказная праца калектываў дадуць плён.

### Шукаць аўдыторыю па ўсіх каналах

Закранаючы праблему скарачэння накладаў друкаваных выданняў, кіраўнік міністэрства канстатавала: гэтая з'ява «сведчыць пра новыя тэндэнцыі, трэнды ў развіцці інфармацыйнага поля».

— Ва ўмовах, калі друкаваны сегмент скарачаецца, трэба шукаць дадатковую аўдыторыю, ужываючы для гэтага адпаведныя тэхналагічныя фарматы, — пераканана Лілія Ананіч.

Так, у мэтах найбольшага ахопу аўдыторыі найважнейшай задачай дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі застаецца развіццё мультымедыйнага складніка ў сваёй працы.

— Прыярытэтным кірункам павінна быць распаўсюджванне кантэнту па максімальна магчымых каналах — друкаваныя, мабільныя, інтэрнэт-версіі, аўдыявізуальныя рэсурсы. І вельмі важна прасоўваць дзяржаўную інфармацыю ў інтэрнэце.

### СМІ павінны быць даступнымі

— Ад якасці працы сферы СМІ ў многім залежыць думкі жыхароў нашай краіны пра дзяржаву ў цэлым, таму гэтая праца вельмі адказная, — у сваю чаргу заўважыла **Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра нашай краіны**, якая прысутнічала на калегіі.

На яе думку, вельмі важна, каб СМІ даносілі аб'ектыўную і праўдзівую інфармацыю да жыхароў нашай дзяржавы.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА і міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ знаёмяцца з навінкамі айчынных кніжных выдавецтваў.**

— Інфармацыя, якая транслюецца ў СМІ, павінна быць дакладнай і аб'ектыўнай, — упэўнена Наталля Качанава. — Калі інфармацыя вырываецца з кантэксту, пераварочваецца і падаецца па-іншаму, відома, гэта выклікае рэакцыю людзей. Навошта абмяркоўваць скажоныя факты? Гэтага проста не павінна быць.

Віцэ-прэм'ер пагадзілася, што сёння рэгіянальныя СМІ маюць папулярнасць сярод насельніцтва.

— Людзі любяць і свае газеты, і сваё мясцовае радыё, і тэлебачанне. Але, несумненна, тыя падзеі, што адбываюцца ў краіне, павінны знаходзіць сваё адлюстраванне і ў рэгіянальных сродках масавай інфармацыі.

СМІ нашай краіны, упэўнена Наталля Качанава, трэба памятаць і пра тую сваю аўдыторыю, што мае абмежаваныя магчымасці.

— Вы ведаеце, што Прэзідэнт падпісаў Канвенцыю аб правах інвалідаў. Мы павінны з вамі не забываць пра гэту катэгорыю людзей. Я ў апошні час вельмі шмат сустракалася з прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый, у канцы года мы праводзілі калегію па правах інвалідаў, на якой прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх міністэрстваў і ведамстваў. Гэтыя людзі сёння павінны мець магчымасць глядзець тэлебачанне, слухаць радыё, чытаць газеты. Мы павінны актыўна працаваць, каб яны маглі задаволіць свае інфармацыйныя патрэбы. У нас ёсць тэлеканал «Жэст», але там у большай ступені ідуць фільмы. Сёння нашы тэлеканалы неабходна насычаць жэставай інфармацыяй.

* * *

Міністр інфармацыі ўзнагародзіла журналістаў і работнікаў выдавецтваў. Ганаровым знакам «Выдатнік друку Беларусі» была ўзнагароджана Юлія Дашкевіч, загадчыца аддзела арганізацыйна-кадравай працы Выдавецкага дома «Звязда». Віншуем калегу!

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Кропка на карце

# ДЗЕЦЯМ СПРЫЯЦЬ — ДЭМАГРАФІЮ ПАВЫШАЦЬ

**Летась у Жодзіне нарадзілася 906 маленькіх грамадзян, на 77 больш, чым у папярэднім годзе. Гэта другое месца сярод рэгіёнаў Мінскай вобласці па натуральным прыросце насельніцтва.**

У Таццяны Каўпаевай з мужам трое дзяцей. Нядаўна сям'я засялілася ў новую кватэру па вуліцы Ракасоўскага, 20, пабудаваную з дзяржаўнай падтрымкай. Да гэтага здымалі куток у чужых людзей, даводзілася часта мяняць месца жыхарства. А гэта немалыя клопаты, стрэс для дзяцей, якія доўга прывыкалі да новай абстаноўкі.

— Вы не ўяўляеце, якое гэта шчасце — мець асабістае жыллё, — не можа стрымаць радасці маладая маці. — У малых з'явіліся асобныя пакоі. А ў мяне, гаспадыні, прасторная кухня. Кватэра нам вельмі падабаецца, тут нават не давялося нічога перараблiць: усё было пафарбавана, паклеена. Словам, здалі яе ў ідэальным стане. Я вельмі ўдзячна мясцовым уладам, якія клапоцяцца аб маладых сем'ях. І перш за ўсё, пра іх жыллёвыя ўмовы. У прыватнасці, наш дом пабудаваны літаральна за год.

За непрацяглы час на ўскрайку горада ўзнік цэлы мікрараён — №8. Толькі за мінулы год тут узведзена пяць жылых дамоў, у ліку навасёлаў і 23 шматдзетныя сем'і. Сёлета плануецца здаць пад ключ яшчэ два кааператыўныя дамы на 108 і 40 кватэр.

— Летась у Жодзіне ўведзена ў дзеянне 44 тыс. квадратных метраў жылля, а сёлета плануецца пабудаваць больш як 40 тыс. «квадратаў». Тут жа, у 8-м мікраёне, практычна ўжо гатовы арэндны дом на 72 кватэры, дзе будуць пражываць сем'і, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — расказаў **начальнік аддзела будаўніцтва Жодзінскага гарвыканкама Уладзімір ЗОРЫЧ.** — Сёння ў мікраёне налічваецца 10 тыс. насельніцтва, шмат малых, падлеткаў. Таму тут узводзіцца дзіцячы садок на 230 месцаў. У хуткім часе пачнецца і будаўніцтва школы на 720 месцаў. Завяршэнне аб'ектаў плануецца ў 2017 годзе.

— У нас невыпадкова на працягу некалькіх гадоў стабільная дэмаграфічная сітуацыя, а маладыя сем'і папаўняюцца немаўлятамі, — працягнула **начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму гарвыканкама Ірына ДУВАНАВА.** — Жодзіна ў 2012 годзе па рашэнні Дзіцячага фонду Арганізацыі Аб'яднаных Нацый прысвоена ганаровае званне «Горад, дружалюбны да дзяцей». Яго даюць населеным пунктам, дзе шмат робіцца для стварэння ўмоў па ахове здароўя малых грамадзян, іх творчага, духоўнага, прафесійнага развіцця. Улада, асабіста **старшыня гарвыканкама Міхаіл АМЕЛЬЯНЧУК**, прадпрыемствы, арганізацыі клапоцяцца пра тое, каб дзеці жылі ў камфорце, бяспецы, развівалі свае здольнасці і таленты. Вось толькі апошні прыклад. У мінулым годзе адкрылі крытую лядовую пляцоўку. Тут дзяцей вучаць фігурнаму катанню і хакею.

**У Жодзіне пасля размеркавання замацоўваецца каля 90% маладых спецыялістаў. Толькі ў сістэму адукацыі за два апошнія гады прыехалі 130 выпускнікоў. І практычна ўсе яны засталіся ў школах, гімназіях пасля абавязковай адпрацоўкі.**

— Самаакупнасць пляцоўкі на сённяшні дзень 52%, — дадаў старшыня гарвыканкама Міхаіл Амельянчук. — Прычым вывучаецца вопыт работы аналагічных аб'ектаў у іншых рэгіёнах краіны для таго, каб павысіць яе эфектыўнасць.

— Нашым юным грамадзянам пашчасціла, што яны жывуць у такім горадзе, — лічыць Ірына Дуванава. — Для іх створана камфортная прастора. Транспартнікі клапоцяцца, каб без затрымак хадзілі аўтобусы, дарожная аўтаінспекцыя, міліцыя сочаць за іх бяспекай, жыллёва-камунальныя службы — за станам вуліц, тратуараў. Нядаўна ў горадзе адкрылі дом сямейнага тыпу, які забяспечылі мэбляй, тэхнікай прадпрыемствы і арганізацыі. Пры гарадскім Савеце дэпутатаў працуе маладзёжны парламент. Старшыня гарсавета Наталля Сушко, старшыня гарвыканкама Міхаіл Амельянчук выслухоўваюць усе ідэі юных парламентарыяў. Многія пачынанні маладых ужо рэалізаваны.

У Жодзіне пасля размеркавання замацоўваецца каля 90% маладых спецыялістаў. Толькі ў сістэму адукацыі за два апошнія гады прыехалі 130 выпускнікоў. І практычна ўсе яны засталіся ў школах, гімназіях пасля абавязковай адпрацоўкі.

— Чым гэта абумоўлена? — пацікавілася ў мэра.

— Шмат якімі фактарамі: наяўнасцю рабочых месцаў, магчымасцю пабудаваць сваё жыллё. А напачатку іншагародні атрымліваюць месца або пакой у ведамасных інтэрнатах: у Беларускага аўтамабільнага завода іх 8, у адкрытых акцыянерных таварыствах «Світанак» і «Кавальскі завод цяжкіх штампоўак» адпаведна 6 і 2, у сістэме ЖКГ — 4, — адказаў Міхаіл Амельянчук. — Хлопцы і дзяўчаты ствараюць сем'і, абзаводзяцца дзецьмі. Так бы мовіць, паляпшаюць дэмаграфію.

Толькі за апошнія пяць гадоў на капітальны рамонт, рэканструкцыю, набыццё сучаснага абсталявання для ўстаноў аховы здароўя затрачана 111 млрд рублёў. Як вынік, значна зменшыўся ўзровень першасных захворванняў. У Жодзінскай цэнтральнай гарадской бальніцы працягваецца капітальны рамонт, у тым ліку і гаспадарчым спосабам. Дзякуючы рэканструкцыі аперацыйнага блока створана пяць аперацыйных, што дазволіла размеркаваць паток пацыентаў для планавых, экстранных, траўматалагічных і гінекалагічных аперацый і давесці іх колькасць да дзвюх з паловай тысяч за год. Медыкі асвоілі шмат новых тэхналогій, укаранілі больш як 120 методык лячэння.

— У нас уведзены ў дзеянне новы тэрапеўтычны корпус, — падзялілася **галоўны ўрач установы Таццяна НІКІФАРАВА**. — Ён размясціўся асобна ад бальніцы. Мяркуецца, што ў наступным годзе запрацуе ў новым фармаце. Акрамя таго, на працягу апошніх гадоў значна абнавіўся парк тэхнікі, закуплена 8 аўтамабіляў хуткай дапамогі, у тым ліку рэанімабіль, што дало магчымасць рабіць аперацыі проста ў машыне.

І гэта вельмі важна, паколькі бываюць выпадкі, калі жыццё чалавека вісіць на валаску і выратаванне жыцця вымяраецца хвілінамі.

Цяпер ідзе рэканструкцыя былога інфекцыйнага корпуса. Сюды перавядуць бальніцу сястрынскага догляду. Пацыенты будуць тут пражываць выключна ў палатах, разлічаных на двух чалавек. У будынку ствараць безбар'ернае асяроддзе.

Нельга не сказаць і пра радзільнае аддзяленне, дзе штодзень на свет з'яўляецца па двое-трое немаўлят.

— У нас ёсць стымул нараджаць дзяцей. У мяне іх двое. Прыехала па трэцяе, — усміхаецца маладая жанчына. — А чаму б і не? Жодзіна расце, квітнее, з'яўляюцца новыя вытворчасці, школы, дзіцячыя сады, жыллё. У горада ёсць будучыня, а значыць, ёсць яна і ў маіх малых.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by* ■

■ Беражыце сябе!

# «КАНТРАЛЁРА ДА КОЖНАГА НЕ ПРЫСТАВІШ»

## На прадпрыемствах сталі ўводзіць калектыўную адказнасць за няшчасны выпадак

**Па статыстыцы, кожны 12-ы няшчасны выпадак на вытворчасці заканчваецца смерцю работніка. Летась на працы загінуў 131 чалавек. І справа не толькі ў дрэнных умовах ці жаданні наймальнікаў сэканоміць на бяспецы. Работнікі самі падвяргаюць сябе непатрэбнай рызыцы: амаль палова тых, хто загінуў на вытворчасці, атрымалі траўму ў тым ліку па сваёй віне.**

### У групе рызыкі — будаўнікі і энергетыкі

Траціна ўсіх здарэнняў адбылася ў арганізацыях камунальнай формы ўласнасці: на аграпрамысловых комплексах, у службах ЖКГ. Калі глядзець статыстыку па дзяржаўных прадпрыемствах, то самай траўманебяспечнай галіной дзейнасці застаецца будаўніцтва: Міністэрства будаўніцтва і архітэктуры паведаміла пра 10 смерцяў. У групе рызыкі — энергетыкі і транспартнікі (у арганізацыях, падначаленых адпаведным ведамствам, загінула па пяць чалавек). Сярод прафесій, дзе працэнт няшчасных выпадкаў найбольшы, таксама апынуліся работнікі лясгасаў, нафтахімічнай і харчовай прамысловасці.

Большасць траўм на вытворчасці адбываецца па віне наймальніка. Але калі за 2014 год такія выпадкі склалі 61 працэнт, то за мінулы — палову. Праз тое што кіраўнікі не выконвалі свае абавязкі па ахове працы і недастаткова інструктавалі пацярпелага, загінула 46 чалавек (больш за чвэрць ад агульнай колькасці памерлых на працы). У 5 працэнтах выпадкаў, што закончыліся смерцю работніка, абсталяванне і інструменты былі няспраўнымі, у 3,5 працэнта недахопы знайшлі ў арганізацыі працоўнага месца. Яшчэ тры працэнты няшчасных здарэнняў адбыліся, калі чалавека прыцягнулі да працы не па спецыяльнасці.

Аднак не трэба здымаць адказнасць з самога работніка. Вось толькі адзін прыклад. Сярод тых, хто атрымаў на працы смяротную траўму, усе былі забяспечаны сродкамі індывідуальнай абароны. Але шасці чалавекам, якія не палічылі патрэбным імі скарыстацца, гэта каштавала жыцця. Пятая частка людзей, што загінулі на вытворчасці, парушылі дысцыпліну і інструкцыю па ахове працы. У 9 выпадках прычынай смерці стала небяспечная эксплуатацыя транспарту ці механізмаў, тры чалавекі загінулі праз асабістую неасцярожнасць.

— Бывае, траўмуюцца маладыя нявопытныя работнікі. Гэта хоць бы можна патлумачыць недахопамі ў іх навучанні бяспецы. Але часцей пацярпелымі становяцца супрацоўнікі са стажам. У нас сярэдні ўзрост тых, хто загінуў, — 44 гады, — акрэслівае праблему **Аляксандр СЕМІЧ, першы намеснік дырэктара Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы.**

### Свядома закрываюць вочы на п'янства

Калі размова заходзіць пра алкаголь на працы, статыстыка няўмольная: чвэрць работнікаў, якія загінулі на прадпрыемствах, былі «пад градусам».

— Праўда, не заўсёды знаходжанне чалавека ў стане алкагольнага ап'янення з'яўляецца прычынай няшчаснага выпадку, — адзначае Аляксандр Семіч. — Самы просты варыянт: ішоў п'яны па будоўлі, на галаву ўпала цагліна. Быў бы чалавек цвярозы, лягчэй бы не стала. Непасрэдна прычынай смерці алкагольнае ці наркатычнае ап'яненне стала ў 6,5 працэнта здарэнняў.

Паўплываць на сітуацыю часткова ўдаецца адміністрацыйнымі мерамі.

— У свой час, пакуль не была прынята Дырэктыва №1 у 2004 годзе, у нас 46 працэнтаў работнікаў, якія загінулі, знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення, — узгадвае Аляксандр Семіч.

Штраф за нецвярозасць у час працы, які ўвялі ў 2010-м, таксама паспрыяў змяншэнню выпадкаў. Апошняя навацыя на заканадаўчым узроўні (яна ўступіла ў сілу пазалетась) значна пашырыла кола асоб, якія падлягаюць перадзменнаму медыцынскаму агляду. Дагэтуль яго мусілі праходзіць толькі кіроўцы і трактарысты. Цяпер у спіс уключаны 14 відаў работ і 45 прафесій. Напрыклад, машыніст крана, аператар кацельнай. Карацей, сферы, дзе п'яны работнік можа не толькі пашкодзіць свайму здароўю, але і нанесці ўрон іншым людзям.

Наймальніку дазволілі праводзіць агляд любога работніка. Раней, каб гэта зрабіць, чалавека трэба было везці ў медустанову. Калі ў Мінску



з гэтым проста, то ў арганізацыях аддаленых — сельскагаспадарчых вытворчых кааператывах, лясніцтвах — праблематычна. Цяпер мадэль іншая: дастаткова паказанняў алкатэстара ці іншай прылады, каб адлучыць нецвярозага работніка ад працы.

— Праблема з правядзеннем перадзменных аглядаў усё роўна ёсць, асабліва ў сельскай мясцовасці, — кажа першы намеснік дырэктара дэпартамента. — Часам службовыя асобы свядома закрываюць вочы, выпускаючы п'янага ці падпітага на працу.

### За траўму аднаго — пакараць усіх

За дзесяць гадоў колькасць смяротных выпадкаў на прадпрыемствах знізілася больш чым удвая. Але праблема застаецца. І, на думку Аляксандра Семіча, ніякі кантроль, ніякія дырэктыўныя меры цалкам яе не вырашаць, пакуль людзі аб уласнай бяспецы сур'ёзна не задумаюцца самі.

— Нельга прыставіць да кожнага работніка кантралёра, — тлумачыць ён. — Вельмі цяжка пакуль да нашага чалавека дастукацца, каб ён зразумеў нарэшце, што ў першую чаргу сам мусіць думаць пра сваю бяспеку.

Каб усё ж такі паспрабаваць дастукацца, прадпрыемствы сталі ўводзіць калектыўную адказнасць за няшчасны выпадак.

— Караецца не толькі пацярпелы і майстар, але і астатнія работнікі дадзенай брыгады, — каментуе **старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў энергетыкі, электратэхнічнай і паліўнай прамысловасці Уладзімір ДЗІКЛОЎ.** — Каб не было такой пазіцыі, маўляў, я нічога не бачыў, не чуў. Так, гэты захад, магчыма, жорсткі. Але здароўе і жыццё чалавека даражэйшыя. Людзі будуць разумець, што калі іх напарнік штосьці робіць не так, то іх усіх, у той ці іншай меры, пазбавяць прэміі.

Добры прыклад — Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман». У іх на прахадной вісіць расцяжка «Год без траўм — кожнаму па мільёне». Кажуць, дзейнічае.

— Апошні раз, калі павышаў кваліфікацыю іх галоўны інжынер, ён распавядаў, што не дай бог хтосьці штосьці парушыць. Калі чалавек палезе без каскі, члены брыгады самі яго спыняць, — дзеліцца ў дэпартаменце.

Пакуль найбольш даходлівая форма прывучыць да правілаў бяспекі — пакараць рублём. Так, кіраўнікам за парушэнне патрабаванняў аховы працы могуць выпісаць штраф ад 5 да 40 базавых велічынь. Максімальная сума — 8,2 мільёна рублёў. Не так ужо і мала, асабліва калі размова ідзе пра дробную фірму.

Арганізацыі мусяць абавязкова страхаваць сваіх работнікаў ад няшчасных выпадкаў і прафесійных захворванняў. Тарыф — 0,6 працэнта ад фонду аплаты працы. Калі ж на прадпрыемстве стан траўматызму ніжэйшы за сярэдні па краіне, яно можа атрымаць зніжку (максімальны памер яе — 50 працэнтаў). І наадварот. Умовы аховы працы горшыя — плаціце з надбаўкай. Атрымліваецца, розніца ў тарыфе можа быць у тры разы. Магчыма, для невялікага прадпрыемства з маленькім фондам аплаты працы гэта неістотныя сумы. А вось для буйных арганізацый розніца будзе адчувальнай.

Разам з тым, калі шкоду работніку нанесла яго ўласная грубая неасцярожнасць, ён часткова пазбавіцца штомесячных страхавых выплат. Іх памер змяншаецца прапарцыянальна ступені віны чалавека, але не больш чым на 50 працэнтаў. За мяжой у такіх выпадках больш катэгарычныя.

— Мы сябруем з французскім, дацкім, нарвежскім прафсаюзамі. Калегі адтуль расказвалі, што ў іх, калі наймальнік выдаў сродкі індывідуальнай абароны, правёў інструктаж, а ты не скарыстаўся імі і атрымаў траўму, ні на якія выплаты можаш нават не падлічваць, — кажа Уладзімір Дзіклоў.

У дэпартаменце мяркуюць, што змяншаць выплаты ў падобных выпадках цалкам лагічна:

— Працоўны дагавор заключаюць два раўнапраўныя бакі: наймальнік і работнік. І кожны бярэ на сябе пэўныя абавязацельствы. Таму адказнасць таксама павінна быць падзелена.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Здароўе

# ТАБЛЕТКІ «АД РАКУ» НЕ БУДЗЕ, АЛЕ ЗНІЗІЦЬ СМЯРОТНАСЦЬ МОЖНА

**У першыя дні лютага адзначаецца Сусветны дзень барацьбы супраць раку. Пра тое, наколькі гэтая праблема актуальная для нашай краіны, сведчыць факт, што кожны 37-ты беларус з'яўляецца анкалагічным пацыентам.**

Мужчыны і жанчыны захворваюць на рак практычна ў аднолькавай прапорцыі, амаль 30% хворых — асобы працаздольнага ўзросту. Сярод мужчын у Беларусі найбольш распаўсюджаны рак прастаты (стаіць на першым месцы), затым рак лёгкага і каларэктальны рак. У жанчын найбольш часта выяўляюць рак малочнай залозы (першае месца), цела маткі і таксама каларэктальны рак.

Усяго ў 2015 годзе на дыспансерным уліку знаходзілася 271 918 анкалагічных пацыентаў, прычым 50,7% з іх — на ўліку ўжо пяць і больш гадоў. Рост анказахворванняў уражвае. Так, калі ў 1990 годзе колькасць упершыню зарэгістраваных захворванняў на рак склала 26 257 выпадкаў, то ў 2014 годзе — ужо 46 тысяч. Лічбы выраслі ледзь не ўдвая!

Летась ад новаўтварэнняў памерлі больш за 17 тысяч беларусаў. Часцей за ўсё гэта былі пацыенты, якія пакутавалі на рак лёгкага, каларэктальны і рак малочнай залозы.

Але ўсё ж такі, нягледзячы на рост анкалагічных захворванняў на 24%, смяротнасць ад іх дзякуючы шэрагу супрацьракавых мерапрыемстваў за апошнія 5 гадоў знізілася на 12%. Як адзначае **дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава Алег СУКОНКА**, паказчык смяротнасці ў Беларусі ніжэйшы, чым у Даніі, Польшчы, Расіі і Украіне.

Анколагі канстатуюць, што дзякуючы пастаяннаму павышэнню кваліфікацыі дактароў і мадэрнізацыі абсталявання цяпер кожны дзень выконваюцца аперацыі, якія яшчэ 10 гадоў таму лічыліся ўнікальнымі ці ўвогуле невыканальнымі. Напрыклад, у мінулым годзе ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі было праведзена 11,9 тысячы аперацый. З іх 1431 — высокатэхналагічная, што ў 2 разы больш, чым пяць гадоў таму.

Тым не менш, па словах доктара медыцынскіх навук, прафесара Алега Суконкі, няма і ў будучыні не будзе аднаго лякарства, якое змагло б вылечыць рак. Занадта гэта складаная і вераломная хвароба. Пакуль усё залежыць ад таго, калі чалавек звярнуўся па дапамогу. Наша глабальная задача, па словах Алега Суконкі, — ранняе выяўленне раку. Сваёй мэтай у наступныя 5 гадоў дырэктар РНПЦ бачыць выяўленне да 70% хворых на першай-другой стадыі раку.

Зараз у Савеце Міністраў знаходзіцца распрацаваная па даручэнні Прэзідэнта праграма «Здароўе народа», часткай якой з'яўляецца скрынінг анкалагічных захворванняў на ранняй стадыі. Згодна з праграмай, у наступныя 5 гадоў плануецца ахапіць абследаваннямі з мэтай ранняга выяўлення анкалагічных захворванняў прыблізна трэціну насельніцтва краіны.

**Святлана БУСЬКО.**

*busko@zviazda.by*

***P.S.** Больш падрабязна пра тое, як у нашай краіне дыягнастуюць і лечаць анкалагічныя захворванні, чытайце ў інтэрв'ю з дырэктарам РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, доктарам медыцынскіх навук прафесарам Алегам Суконкам, якое выйдзе ў найбліжэйшых нумарах «Звязды».*

■ Надвор'е

# У НЯДЗЕЛЮ — НОВАЯ ХВАЛЯ ЦЯПЛА

## У гэты дзень тэмпература паветра будзе дасягаць плюс 8-10 градусаў

**Такога мяккага лютага айчынныя сіноптыкі яшчэ не адзначалі — тэмпературны фон адпавядае амаль што пачатку красавіка. Будзе анамальна цёпла і надалей, упэўнены спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



У суботу нашым надвор'ем будзе кіраваць малаактыўны атмасферны фронт, які зміяшчаецца з Заходняй Еўропы. Толькі месцамі пройдуць невялікія кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу, які ўдзень будзе пераходзіць у дождж. У асобных раёнах чакаецца слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Уначы тэмпература паветра складзе ад мінус 5 градусаў да 1 цяпла, удзень чакаецца ўжо ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, а па захадзе — да 6 цяпла.

Амаль сапраўдная вясна чакаецца ўжо ў нядзелю. Тады на тэрыторыю краіны пачнуць паступаць больш цёплыя паветраныя масы з паўднёвага захаду Еўропы. Уначы і раніцай месцамі пройдуць невялікія ападкі, а ўдзень будзе пераважна суха. Уначы і раніцай чакаюцца слабы туман, галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 3 цяпла, удзень — плюс 2—7 градусаў, а па паўднёвым захадзе краіны — да 8—10 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у першай палове наступнага тыдня тэрыторыя Беларусі будзе знаходзіцца пад уплывам атмасферных франтоў і паветраных мас, якія рухаюцца да нас з боку паўднёвага захаду Еўропы. Таму і надалей чакаецца няўстойлівае і вельмі цёплае для лютага надвор'е.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ З нагоды

# НА АДНОЙ МОВЕ

## Краінай — ганаровым госцем XXIII Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу, якая адкрыецца 10 лютага, выступіць Рэспубліка Арменія

**Гісторыя кнігавыдання гэтай краіны вельмі старажытная — першая кніга на армянскай мове з'явілася на 5 гадоў раней за скарынаў «Псалтыр». У 405 годзе быў створаны армянскі алфавіт, які на працягу больш як тысячы шасціста гадоў існуе амаль без змен. Армянскай літаратуры навукоўцы адводзяць найважнейшую ролю ў захаванні нацыянальнай ідэнтычнасці. Кнігі ў Арменіі шанаваліся як святыні. Іх берaглі, ратавалі ад захопнікаў, выкуплялі. У летапісах пра кнігі пішуць, як пра жывых істот, «узятых у палон», «вызваленых з палону».**



Напярэдадні выставы спецыяльна для газеты «Звязда» **міністр культуры Рэспублікі Арменія Асмік ПАГАСЯН** расказала пра тое, як дзве краіны, Беларусь і Арменія, гавораць на адной мове — на мове культуры.

***— Асмік Сцяпанаўна, як вы ахарактарызуеце цяперашні ўзровень сувязяў Арменіі і Беларусі ў сферы культуры?***

— З Рэспублікай Беларусь нашы сяброўскія і дзелавыя сувязі ў галіне культуры маюць доўгія традыцыі і гісторыю, і мы ім надаём вялікую важнасць. Падпісанае ў 2003 годзе міжведамаснае пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам культуры і па справах моладзі Рэспублікі Арменія і Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь у галіне культуры, адукацыі і навукі, па сутнасці, толькі замацавала на паперы тое сапраўднае становішча спраў, якое ў нас склалася. На аснове гэтага пагаднення двума міністэрствамі распрацоўваюцца двухгадовыя праграмы супрацоўніцтва, у якіх вызначаюцца канкрэтныя напрамкі і праекты. Праграма, якая дзейнічае цяпер, была падпісана ў Ерэване ў 2014 годзе, у рамках Дзён культуры Беларусі.

За апошнія дзесяць гадоў адбылося дзесяць візітаў афіцыйных дэлегацый, абменныя Дні культуры пры ўдзеле вядучых калектываў дзвюх краін. У 2014 годзе, калі ў Арменіі праходзілі Дні культуры Беларусі, беларускую дэлегацыю ўзначальваў міністр культуры Барыс Святлоў.

У рамках міждзяржаўнай праграмы ў 2013 годзе культурнымі сталіцамі СНД былі абвешчаны Гюмры і Магілёў.

***— У якіх сферах мастацтва армяна-беларускае супрацоўніцтва дэманструе найбольшую актыўнасць?***

— Цяжка вылучыць нешта адно. Хацела б асабліва адзначыць фестываль «Славянскі базар», у якім прадстаўнікі Арменіі ўдзельнічаюць з 2003 года. За гэтыя гады ў ім узялі ўдзел 14 выканаўцаў і вакалістаў. Містар Ікс, Ані Крысці і Сяргей Хачатран былі ўдастоены спецыяльнай прэміі. Нашы спявачкі Карыне Асіран і Анаіт Шахбазян сталі лаўрэаткамі 2-й прэміі, а Мікаэл Варасян у 2014 годзе быў узнагароджаны 3-й прэміяй.

Летась у дзіцяча-юнацкім фестывалі «Залатая пчолка» ўдзельнічаў наш танцавальны ансамбль «Армелад». У тэатральным фестывалі «Белая вежа» прымалі ўдзел амаль усе вядучыя тэатральныя калектывы Арменіі, у прыватнасці Дзяржаўны рускі драматычны тэатр імя Канстанціна Станіслаўскага, Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Габрыэла Сундукяна, студэнцкі тэатр Дзяржаўнага інстытута тэатра і кіно. У 2015 годзе ў фестывалі прымаў удзел акцёр Роберт Акапян з монаспектаклем «Начная размова».

Акрамя гэтага, на такіх прэстыжных беларускіх кінафестывалях, як «Лістапад», «Анімаёўка», «Сінема перпетум мобіле» ў розныя гады былі прадстаўлены лепшыя працы сучасных армянскіх рэжысёраў: Роберта Саакянца, Мікаэла Ваціньяна, Армена Гаспарана.

У сваю чаргу, прадстаўнікі Беларусі прымалі ўдзел у самых розных армянскіх фестывалях і конкурсах. Так, у Міжнародным конкурсе імя Арама Хачатурана ўдзельнічалі Валерыя Гугуль (альт), Андрэй Іваноў (фартэпіяна), Галіна Сікорская (скрыпка), а ў мінулым годзе — Паліна Чарняўская (скрыпка). На міжнародным фестывалі монаспектакляў «Арммона» з пастаноўкай «Верабей, які рыкае» выступіла Алена Дудзіч.

Нашыя беларускія сябры — частыя госці і на міжнародным кінафестывалі «Залаты абрыкос», дзе ў розных конкурсных намінацыях было прадстаўлена беларускае кіно (кінастужка «Брэсцкая крэпасць» рэжысёра Аляксандра Каты, «У тумане» Сяргея Лазніцы (быў узнагароджаны прэміяй кінафестывалю ў 2012 годзе), «Скрыжаванне» Настассі Міршнічэнкі. Вядучыя рэжысёры з'яўляліся членамі журы кінафестывалю (Сяргей Лазніца). У рамках таго ж кінафестывалю асобнай кінапраграмай былі прадстаўлены работы Уладзіміра Дашука, у тым ліку яго карціна «Жыццё, якое яно ёсць». Беларускія кінарэжысёры ўдзельнічаюць таксама ў кінафестывалях « РэАніманія», «Кін» («Жанчына»).

Варта адзначыць, што Дні беларускага кіно былі асобнымі складнікамі Дзён культуры Беларусі ў Арменіі.

У фармаце двухбаковага супрацоўніцтва арганізоўваліся таксама цікавыя і маштабныя выставы. У прыватнасці, у Мінску праводзіліся выстаўкі работ Марцірос Сар'яна, Сяргея Параджанава, Акопа Акапяна, Арэвік Петрасян, а ў Ерэване — выстаўкі беларускай народнай творчасці.

Асаблівы ўпор хацела б зрабіць на двух сумесных выставачных праектах: «Бясконцасць» і «Эстамп» (сумесная выстава графікі маладых мастакоў Арменіі і Беларусі ў Мінску і Ерэване 2006—2007 гады), ну і, вядома, удзел армянскіх мастакоў у магілёўскім пленэры, а беларускіх мастакоў і скульптараў — у праектах «Цёплыя колеры Арменіі» і сімпозіуме скульптур у Гюмры.

Арменія з'яўляецца і пастаянным удзельніцай Мінскага міжнароднага кніжнага кірмашу. У 2012 годзе, калі Ерэван быў абвешчаны сусветнай сталіцай кнігі, Арменія з'явілася цэнтральным экспанентам гэтага кірмашу. У 2016 годзе Арменія паўстане на кніжнай выставе ў якасці ганаровага госця.

У розныя гады ў рамках выставы арганізоўваліся прэзентацыі кніжных навінак пры непасрэдным удзеле аўтараў, творчыя сустрэчы. Так, напрыклад, у 2014 годзе была прэзентавана кніга «Люблю цябе, Айчына» (прадстаўлены творы армянскіх і беларускіх пісьменнікаў, створаныя ў апошнія два дзесяцігоддзі), якая была выдадзена ў рамках ініцыяванага Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь творчага праекта «Сугучча: літаратура і публіцыстыка краін СНД».

Увогуле ўражвае тая шматабсяжная выдавецкая дзейнасць, работа ў галіне прыгожага пісьменства, якую ажыццяўляе Міністэрства інфармацыі Беларусі. Мы рады, што напярэдадні выстаўкі выйшла беларуская кніга старшыні Саюза пісьменнікаў Арменіі Эдварда Мілітаняна «Паветраны дом». Ведаю, што ён, аўтарытэтны армянскі паэт, спрычыніўся і да стварэння кнігі «Францыск Скарына на мовах народаў свету». Прыемна, што беларуская дзяржаўныя літаратурна-мастацкія выданні прыязна ставяцца да развіцця армяна-беларускага культурнага ўзаемадзеяння. Хацела б адзначыць, што творы армянскіх пісьменнікаў размешчаны таксама на сайце «Сугучча».

***— У Арменіі ёсць беларускае таварыства. Нашым чытачам будзе цікава даведацца аб дзейнасці сваіх суайчыннікаў у Арменіі.***

— Беларуская суполка Арменіі «Беларусь», арганізаваная ў 1998 годзе (кіраўнік — Ірына Пагасян/Таболіч), шмат у чым спрые развіццю армяна-беларускіх культурных сувязяў. Пры суполцы дзейнічае нядзельная школа з бібліятэкай, вакальны гурт «Родныя карані», дзіцячы вакальны ансамбль «Крынічка», тэатр «Лялькі». Выдаецца газета «БЕЛАРУСЫ.am», адзначаючы беларускія народныя святы: Каляды, Масленіца, Купалле, дажынкі, праводзяцца літаратурныя мерапрыемствы. Таварыства з'яўляецца пастаянным удзельнікам фестывалю мастацтваў нацыянальных меншасцяў, якія пражываюць на тэрыторыі Арменіі. У 2015 годзе яно ўдзельнічала ў мерапрыемствах, прымеркаваных да 100-годдзя генацыду армян, арганізавала і правяло святочны канцэрт, прысвечаны 70-годдзю Вялікай Перамогі і конкурс міні-спектакляў на тэму «Гарады-героі» сярод школ Арменіі.

**Ірына АБРАЯН,**
*г. Ерэван*

■ Новыя вышыні

# АРКТЫЧНЫ ДЭСАНТ



**Беларускія дэсантнікі другі раз маюць намер скарыць Паўночны полюс. Разам з калегамі з іншых краін ваеннаслужачыя Узброеных Сіл Беларусі стануць удзельнікамі ўнікальнай гуманітарнай аперацыі.**

Першая сустрэча з Паўночным Ледавітым акіянам у вайскоўцаў нашых сіл спецыяльных аперацый адбылася летась. Дэбютнае дэсантаванне парашутным спосабам на Паўночным полюсе здзейснілі сумесна з расійскімі ваеннаслужачымі з паветрана-дэсантных войск.

— Сёлета фармат мерапрыемства крыху будзе зменены, — паведаміў **намеснік камандуючага сіламі спецыяльных аперацый па паветрана-дэсантнай падрыхтоўцы палкоўнік Уладзіслаў СЦЕПАНЮК.** — Галоўнае, яно стане больш масавым: запланавана дэсантаванне парашутным спосабам 300 ваеннаслужачых (у мінулым годзе іх было 45). Падрыхтоўка да высадкі на Паўночны полюс пачнецца ў трэцяй дэкадзе сакавіка, а само дэсантаванне — у пачатку красавіка. Рыхтавацца нашы вайскоўцы будуць у горадзе Пскове сумесна з дэсантнікамі з 76-й паветрана-дэсантнай дывізіі.

Пад падрыхтоўкай маецца на ўвазе падбор асабістага складу па маральна-псіхалагічных якасцях, па стане здароўя. Акрамя таго, вайскоўцы павінны ўмець дзейнічаць у экстрэмальных умовах. Немалаважны фактар — і паветрана-дэсантная падрыхтоўка. Таксама спецназаўцы, якія выпраўляюцца ў Арктыку, павінны ўмець карыстацца сродкамі сувязі і тапаграфіі, аказваць медыцынскую дапамогу, перамяшчацца па мясцовасці з выкарыстаннем снегатупаў, лыжаў і іншых механічных сродкаў. Навучацца дэсантнікі і здабываць ваду. У такіх умовах гэта цэлая навука.

Акрамя нашых і расійскіх ваеннаслужачых, у гуманітарнай аперацыі на Паўночным полюсе возьмуць удзел вайскоўцы з Арменіі і Таджыкістана. Правядзенне падобных сумесных мерапрыемстваў садзейнічае ўмацаванню ваеннага міжнароднага супрацоўніцтва.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*



Фота Канстанціна ГАГАРЫНА.

# ЦЯПЛО КОЛАСАЎСКАЙ СЯМ'І

**У Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа прайшла вечарына, на якую ўдзячныя госці сабраліся, каб віншаваць сына Якуба Коласа — Міхася Міцкевіча з яго 90-годдзем і добрымі словамі ўспомніць Марыю Каменскую ў сувязі са 125-годдзем з дня нараджэння.**

Малодшы сын народнага песняра Беларусі дзяліўся сваёй памяццю пра маці — Марыю Дзмітрыеўну. Трох сыноў-дубочкаў выгадавала яна разам з мужам-паэтам. Прыняла на свае плечы шматлікія клопаты, вырашэннем якіх толькі спрыяла творчаму плёну Коласа. Вечарына ў музеі, на якую віншаваць Міхася Канстанцінавіча і ўвогуле чарговы раз вітаць цёплую Коласаўскую сям'ю прыйшлі пісьменнікі, навукоўцы, блізкія музею людзі, прайшла на адным дыханні. Усе з зачараваннем слухалі не толькі доктара тэхнічных навук Міхася Канстанцінавіча Міцкевіча, але і яго дачку, унучку Якуба Коласа — Марыю Міхайлаўну Міцкевіч. Прыемна было слухаць, бачыць у шчырай атмасферы скарбніцы Коласаўскай памяці Радзіма Гарэцкага, Васіля Зуёнка, Казіміра Камейшу, Яўгена Хвалея, Анатоля Валахановіча, Міколу Мятліцкага, Анатоля Вярцінскага, Тадэвуша Стружэцкага ды шмат каго яшчэ.

Падарункам Міхасю Канстанцінавічу Міцкевічу ад Выдавецкага дома «Звязда» стала кніга Наталлі Міцкевіч «Доўгая дарога ад Янкі Маўра да дома Якуба Коласа», якая толькі што пабачыла свет.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ТРЫ РУЧНІКІ НА ШЧАСЦЕ

## ЯК ЗБІРАЦЬ МАЛАДЫХ НА ВЯСЕЛЛЕ

**Фальклорныя вандроўкі з праектам «Наперад у мінулае» тэлеканала «Беларусь 3» — гэта магчымасць кожны раз рабіць адкрыцці. Слухаючы песні, назіраючы за побытам у сучасных беларускіх гарадах і вёсках, заводзячы знаёмствы з тымі людзьмі, якія старанна збіраюць і зберагаюць родныя матывы, з дзяцінства знаёмыя звычаі — усю тую спадчыну, якая з'яўляецца асновай кожнага з нас. Бо нават калі чуеш, маўляў, добра там, дзе нас няма, то думаецца пра тое, што не ўмеючы шанаваць сваё — наўрад ці будзеш ведаць цану чужога... У адной з чарговых фальклорных экспедыцый са здымачнай групай праграмы «Наперад у мінулае» мы пабывалі ў вёсцы Новы Свержань Стаўбцоўскага раёна.**

Само мястэчка стаіць на левым беразе Нёмана. Паводле архіўных крыніц, вёска ўпершыню згадваецца ў 1428 годзе. Акурат тады князь Вітаўт падпісаў завяшчальную грамату сваёй «наймілейшай сужонцы» Юльяне на валоданне ёю пасля ягонай смерці. Па пісьмовых крыніцах вядома з 1568 года як мястэчка Свержань Навагрудскага павета, якое мела царкву і млын, а на правым беразе Нёмана — замак. У 1575 годзе мястэчка стала ўладаннем Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі, які ў 1588 годзе заснаваў тут касцёл (існуе і сёння, вядомы як Петрапаўлаўскі), а ў 1590-м — храм (цяпер гэта царква Успення Прасвятой Багародзіцы). У 1742 годзе Міхал Казімір Радзівіл пабудаваў Свержанскую фаянсавую мануфактуру. Увогуле ў XVIII ст. мястэчка атрымала назву Новы Свержань і адсюль пачынаўся нёманскі гандлёвы шлях у Каралявец (г. Кёнігсберг)...

Сёння жыццё вёскі таксама не стаіць на месцы. Працуюць школы, крамы, амбулаторыя і многае іншае. Тут мы пазнаёміліся з удзельнікамі народнага хору «Панямонь» Навасвержанскага дома культуры. Калектыў пачаў сваю дзейнасць у 30-я гады мінулага стагоддзя, а званне «народны» атрымаў у 1976 годзе. Сёння тут спяваюць 18 чалавек, і пачуць у іх выкананні можна як аўтарскія, так і народныя беларускія, рускія, украінскія песні. Нам пашчасціла яшчэ і ўбачыць дэманстрацыю вясельнага абраду, які ў свой час аднавіла хормайстар калектыву Ала Янская.

— Гэты абрад быў сабраны намі з усёй Стаўбцоўшчыны. Шмат элементаў мы ўзялі ў вёсцы Мікалаеўшчына, дзе нарадзіўся Якуб Колас. Яго пляменніцы таксама перадалі нам цудоўную песню, якую маці пісьменніка Ганна Юр'еўна спявала ў свой час на ўсіх вяселлях, — расказвае Ала Пятроўна. — Песню гэтую мы не ўводзілі ў вясельны абрад, але яна «аналізуе» ўсё жыццё маці Якуба Коласа. І, мусіць, усіх жанчын таго часу...

*Прыстройся, дзяўчына, ты гожа,*
*Як у дзянёчак святы.*
*Чашы галоўку прыгожа,*
*Прыехалі сёння сваты...*
*Дасць бацька ў пасаг карову,*
*Курэй, ягня, парася,*
*А маці ў пасаг падушкі*
*І куфар адзін палатна.*
*Усё гэта возьме твой мілы,*
*Як быццам то куплена ім,*
*І будзеш яму да магілы*
*І жонка яму, і слуга.*
*Жаць пойдзеш далёка ці блізка,*
*Муж пойдзе касіць ці араць.*
*З табою дзіця і калыска*
*На полі, на козлах стаяць.*


На пасад маладую вядзе родны брат.

Яшчэ прыгаворваюць: «Колькі шарсцінак на гэтым кажусе, столькі жадаем дабра і прыбытку ў хаце». Потым маці маладой блаславіляе дачку з абразком. А брат запальвае свечку і абходзіць з ёю вакол сястры (гэта робіцца з мэтай, каб усё ліхое каля нявесты згарала і толькі добрае ў хаце бывала), а затым абсыпае маладую зернем (няхай дзеткі будуць, як кветкі).

Працягваецца дзейства тым, што «вядучая» запрашае маладую развітвацца з бацькамі, сястрой, братам, суседзямі: «Вось карыся, дзеванька, карыся. Кожнаму да ножак пакланіся. Старога, малога не мінай. Кожнаму да ножак нізенька, хай твая долечка будзе добранькай». Тут гучыць наступная песня:


«Кланяюся табе, мама, што была ў цябе я ўбрана...»

...Потым нам паказалі сам вясельны абрад, праўда, у скарочаным выглядзе. Пачалося ўсё з выканання калектывам песні «Вышыванка» (дзяўчына ўласнаручна расшывала кашулю любага ўзорам, каб сэрца хлопца заўсёды саграване каханне). Тым часам да стала, на якім стаяць зерне, мёд, свечка, каравай і абразок, выходзяць маладыя. Іх сустракае і на працягу ўсяго абраду праводзіць Ала Пятроўна (на сапраўдных вяселлях звычайна такую ролю выконвае свацця альбо найстарэйшая жанчына ў сям'і) і ўдзельнікі хору «Панямонь», якія, прывітаўшы жаніха з нявестай, з песняй адпраўляюць іх на пасад.

*Ой ляцелі гусенькі*
*цераз сад,*
*Запрашалі дзевачак*
*на пасад.*
*Ой да асыпаецца вішнёвы*
*сад,*
*Час ужо вам, дзевачкі,*
*на пасад...*


Каб жыццё было з саладкам, свякроў частуе мядком.

Важна адзначыць, што паводле традыцыі, маладога ставяць на пачатку стала (які знаходзіцца ў чырвоным куце), каб жыццё было заможным. А нявесту садзіць на пасад (на дзяжу з накінутым на яе кажухом) родны брат альбо стрыечны. Дзеянне гэтае таксама суправаджаецца песняй.

*Сонейка ды па кругу ідзе,*
*Брат сястру на пасад*
*вядзе*
*Да за белую ручку.*
*Горка плача, месца прача...*

*Як я была ехала, як я была ішла,*
*А я ж сваймў татачцы не кланілася.*
*Кланяюся табе, тата, мо была я зухавата,*
*Больш не буду, больш не буду я.*
*Як я была ехала, як я была ішла,*
*А я ж сваёй мамачцы не кланілася.*
*Кланяюся табе, мама, што была ў цябе*
*я ўбрана...*

Развітаўшыся са сваёй раднёй, нявеста пераходзіць у новую сям'ю, дзе першай прымае дзяўчыну свякроў. «Пакланіся і новай матулі ў ногі. Хай будуць светлымі, шырокімі і лёгкімі твае дарогі», — заклікаюць маладую. І хор зноў выконвае песню:

*Ой, сваццеечка,*
*ой, галубачка,*
*Просім вас, каб не было*
*кепска*
*Нашай Танечцы ды*
*ў вас,*
*Каб не стаяла з цёмнай*
*ночачкі*
*Пад акном,*
*каб не ўцірала*
*Дробных слёзачак*
*рукавом...*

Новая матуля ў адказ корміць нявесту мядком, каб жыццё было з саладкам. Толькі пасля гэтага дзяўчыну перадаюць у рукі нарачонага, выконваецца старадаўні абрад «Тры ручнікі».

— Да маладых заходзяць са спіны, таму што ў нас ёсць на патыліцы ямачка, праз якую можна пасласць сурокі. І на вяселлі чым большая дружына стаіць за маладымі, тым лепш для іх. Каб ніхто да іх блізка не падыходзіў, — тлумачыць Ала Пятроўна і выконвае неабходныя дзеянні. — Накрываем вашы галовы, дзеткі, першым ручніком. Няхай вас святыя аберагаюць. Няхай нячысцікі са шляху не спіхаюць. І каб вы знаходзілі тую дарожку, што прывядзе да роднага парожка... Гэтым жа ручніком мы абкладзём вясельную ікону. Яна будзе суправаджаць усё ваша сумеснае жыццё, вісець у вас на покуце. Перавязваю вас цесненька-цесненька, дзеткі, другім ручніком, каб хутка ваша хата зазвінела дзіцячым галаском. Зараз ручнік мы пакладзём пад вясельны каравай. А калі ў вашай сям'і нарodзіцца першае дзіця, то вы павінны прыняць яго ў гэты ручнік. Трэцім ручніком перавязваем вашы ручкі моцна-моцна, бо да сённяшняга часу вы ішлі кожны сваёй сцяжынкай, а сёння яны зліліся ў адзін вялікі шлях. Ідзіце па жыцці. Няхай вашы палкія сэрцы б'юцца толькі ва ўнісон...

Маладых абводзяць вакол стала. Спачатку жонка ідзе за мужам як за верным служам, другім разам пойдзе муж за жонкай, як нітка за іголкай. Потым маладыя жаніх з нявестай стаяць і слухаюць яшчэ адну кранальную песню... Яе мне даводзілася не аднойчы чуць на вяселлях і ў сваёй вёсцы, праўда на ўкраінскі манер і ў больш разгорнутым варыянце...

*Гарэла сосна, палала,*
*Пад ёю дзеўка стаяла,*
*Русую косу часала.*
*Ой косы, косы вы мае,*
*Мала служылі вы ў мяне,*
*Болей служыць не будзеце,*
*Пад белы вэлюм пойдзеце...*

Завяршаецца дэманстрацыя вясельнага абраду праходам маладых праз трое варот (зробленых з ручнікоў) і ваджэннем святочнага карагоду, таксама з песняй. Дарэчы, і сёння элементы гэтага абраду можна сустрэць на вяселлях. Нехта просіць іх правесці, бо лічыць, што робіцца гэта прыгожа, а іншыя вераць, што ўсе дзеянні будуць абярэгам іх дзецям у будучым сямейным жыцці... Відэаверсію ў хуткім часе можна будзе пабачыць у праграме «Наперад у мінулае». Сачыце за эфірамі праекта і занатоўвайце мудрасць, правераную вякамі і пакаленнямі.

**Алена ДРАПКО.** *drapko@zviazda.by*



## Аўторак, 9 лютага

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.30** Зона Х.
**9.10, 22.10 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.50 Серыял «Простае жыццё».**
**12.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.25** Дзень у вялікім горадзе.
**14.25** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Пастка».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20, 23.45** Сфера інтарэсаў.
**20.00, 0.35 Серыял «Не пакідай мяне». Заключная серыя.**
**21.00** Панарама.
**21.45** Буйным планам.
**0.20** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 17.25** «Вайна нявест». Рэаліці-шоу.
**9.40, 20.00** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**10.35, 16.20 Трылер «Закрытая школа».**
**11.40, 21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**12.40, 17.55 Серыял «Вароніны».**
**13.50, 22.05, 23.55** Скетчком «Рыжыя».
**14.25, 19.00 Серыял «Кухня».**
**15.30, 23.05** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**0.25 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

### Беларусь 3

**7.20** М/ф.
**8.00, 13.00, 18.15, 0.25** «Калейдаскоп».
**8.15** «Гісторыя Беларусі».
**8.25 «Людзі на балоце. Палеская хроніка». Кінаэпапея. «Сумёты на дарогах».**
**9.30** «Рок». Дак. фільм.
**10.55 «Мой сябар Іван Лапшын». Драма.**
**12.30** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа.
**13.15, 18.30** «Размаўляем пабеларуску».
**13.20** «Час кіно».
**13.30 «Я родам з дзяцінства». Драма.**
**15.00** «Кіно і час». І з'езд РСДРП.
**15.40** «Доблесць зямлі беларускай». «Штурм «Мядзведжага валу». Дак. фільм.
**15.55 «Федра». Драма.**
**17.50, 0.00** «Дыя@блог». «Правечнае».
**18.40, 21.00** «На сопках Маньчжурыі». Дак. фільм.
**19.30 «Людзі на балоце. Палеская хроніка». Кінаэпапея. «Калядныя маразы».**
**20.40** «Калыханка».
**21.55 «Чырвоныя званы». Маст. фільм. «Мексіка ў агні».**

### Беларусь 5

**7.35** PRO спорт. Вынікі.
**8.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**9.00** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Хімкі» — ЦСКА (Масква).
**10.40** Спорт-мікс.
**11.00, 22.05** Тэніс. Турнір WTA. Санкт-Пецярбург.
**17.00** Біятлон. Этап Кубка свету. Кэнмор. Масстарт. Мужчыны.
**17.50** Біятлон. Этап Кубка свету. Кэнмор. Масстарт. Жанчыны.
**18.45** Спорт-кадр.
**19.15, 21.55** PRO спорт. Навіны.
**19.25** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. Фінал. «Кярпят» (Фінляндыя) — «Фрэлунда» (Швецыя).
**0.00** Формула-Е. Гран-пры Аргенціны.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.35** «Бесталковыя нататкі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05** «Час пакажа».
**16.20** «Таблетка».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Метад Фрэйда 2».**
**22.55 Баявік «Драйв».**
**0.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Драма «Я — Сэм».**
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50** «Наша справа».
**14.05, 23.40 «Знахар». Серыял.**
**15.50** «Ведай нашых!»
**16.50** «Цэнтральны рэгіён».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Тэрыторыя памылак».
**22.00** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**23.20** «Аўтапанарама».
**1.20** «Дакументальны праект»: «Мая жонка марсіянка».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Агульныя інтарэсы».
**9.30, 1.05 Маст. фільм «Не хапала клопату».**
**10.55 Маст. фільм «Скарбы О.К.».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Медыцынская праўда».
**13.45, 2.20 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**14.15, 20.05 Серыял «Развод».**
**15.00, 3.45** «Справы сямейныя».
**16.20** «Сакрэтныя матэрыялы».
**16.50, 3.20** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**17.20, 19.20 Серыял «Дзяжурны анёл».**
**21.05 Маст. фільм «Спартак і Калашнікаў».**
**23.00 Серыял «Кароткі курс шчаслівага жыцця».**
**23.55** Галоўная тэма.
**0.10** Ток-шоу «Слова за слова».
**2.50** Дак. серыял «Іншы свет».
**4.10 Маст. фільм «Светлы шлях».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 23.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.25** «Замах на Данаю». «Прататыпы. Шрэк».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Каменская».**
**19.10, 20.55 Серыял «Земскі доктар».**
**22.00, 23.10 Серыял «Сонца ў падарунак».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10 Серыял «Хвост».**
**7.10** «Новыя рускія сенсацыі».
**8.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Святло і цень маяка».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25, 21.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.10 Серыял «Браценікі».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**20.00 Серыял «Пчаляр».**
**22.00** «Вынікі дня».
**22.30 Серыял «Чалавек без мінулага».**
**0.10 Серыял «Глухар. Працяг».**

### 8 канал

**7.00, 14.05, 19.45, 21.00, 23.55** Надвор'е.
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.50 Серыял «Песня лёду і полымя».**
**8.30, 18.30 Серыял «Каханне імператрыцы».**
**9.35, 12.55, 13.50, 14.10, 15.45, 16.45, 18.25, 19.35, 20.55** «Хатняя крама».
**9.45** «Мой любімы гадаванец».
**10.15** Дак. серыял «Іерогліф сяброўства».
**11.30 Драма «Гаспадар тайгі».**
**13.00 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
**14.15 Серыял «Каханне і страх».**
**16.30** «Кінаблакнот».
**17.00 Серыял «Доўгая дарога ў дзюнах».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Драма «Прывіды мінулага».**
**23.10 Серыял «У пустыні смерці».**

### ВТБ

**6.00, 17.00, 0.00** «Лаві момант».
**6.30, 22.50, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.30** «Ералаш».
**8.30, 18.00, 23.30** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Васьмідзясятыя 5».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Маладзёжка 3».
**11.30** Камедыя «8 першых спатканняў».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30, 0.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**21.10** Камедыя «Змяшаныя пачуцці».
**1.00, 3.30** «Дурні і дарогі».
**1.30** Серыял «Нямы сведка».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Наглядальнік».
**11.15, 0.50** «Два гусары». Маст. фільм. 2-я серыя.
**12.20** «Алег Янкоўскі. Палёты наяве». Дак. фільм.
**13.05** «Эрмітаж».
**13.35, 20.45** «Правілы жыцця».
**14.00** «Якая прырода крэатыўнасці». Дак. фільм.
**15.10, 23.50** Выдатныя дзеячы культуры. Юрый Лотман. «Пушкін і яго асяроддзе». «Жанчыны».
**16.10** «Саці. Нясумная класіка...»
**16.50** Сусветныя скарбы.
**17.05** Замежная справа. «Вялікі пасол».
**17.45** Майстры фартэпіяннага мастацтва. Андрэй Карабейнікаў.
**18.45** «Рэгтайм, або Разарваны час». «Уланава, Сар'ян і філосафы».
**19.15** «Добрай ночы, малышы!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Штучны адбор.
**21.10** Навука без межаў. «Фантастычнае падарожжа ў свет нанамедыцыны». Дак. фільм.
**22.00** «Аркадскія пастухі» Нікола Пусэна». Дак. фільм.
**22.10** «Гульня ў бісер». «Лопэ дэ Вега» Сабака на сене».
**22.55** «Рассакрэчаная гісторыя». Дак. серыял.
**23.45** Мастсавет.

### Настальгія

**6.00** «Акулы пяра». Мікалай Наскоў і гурт «Мікалай».
**6.45, 7.55, 9.40, 11.20, 12.55, 14.30, 15.40, 17.00, 19.05, 20.30, 21.40, 23.00, 1.15, 2.45, 3.50, 5.20** Музычная настальгія.
**7.30** Маст. фільм «Ля мора, дзе мы гулялі».
**8.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...». Булат Акуджава.
**10.00** Маст. фільм «Алеся».
**12.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Міцькі». Дзмітрый Шагін, Канстанцін Батынкоў. 2005 год.
**13.10** Маст. фільм «Блакітныя маланкі».
**14.45, 20.45** Кіначасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**15.00, 21.00** «Мінулы час».
**16.00, 22.00** «Народжаны ў СССР».
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Палітkоўскім: «Тэлебачанне Перабудовы: праграма «Погляд « 2006 год.
**19.20** Маст. фільм «Кожны вечар пасля працы».
**0.00** «Зямля—Паветра». Найк Барзоў.
**2.30** М/ф «Мыйдадзір».
**3.00** «Быў час». 2009 год.
**4.00** Маст. фільм «Кветкі лугавыя».

### EuroSport 1

**3.30, 6.00, 10.45, 18.00, 20.15, 1.50** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**5.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
**7.00, 12.00, 22.05, 2.15** Футзала. Чэмпіянат Еўропы.
**9.00, 14.00, 14.25** Футбол. Еўрагалы.
**9.30** Снукер. «Мастэрс». Фінал.
**10.30 , 14.30, 16.00** Watts.
**14.05** Футбол. Яго Вялікасць футбол.
**14.45, 17.00** Лыжнае двяабор'е. Кубак свету.
**18.30** Біятлон. Кубак свету.
**0.35** Аўта- і матаспорт. Аргенціна.
**1.15** Ралі. За кулісамі ERC.

### Камедыя

**0.45** Камедыя «Нешта падобнае на шчасце».
**2.20** Камедыя «План Б».
**4.00** Камедыя «Жудасны Генры».
**5.40, 21.25** Камедыя «Трайныя непрыемнасці».
**7.15** Меладрама «Поспехаў, Чак».
**9.00** Камедыя «Той яшчэ Карласан!».
**10.35** Меладрама «Каханне з перашкодамі».
**12.25** Камедыя «Матулі».
**14.00, 14.50, 15.40, 17.40** Скетчком «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Дзікая штучка».
**18.00** Камедыя «Карсіканец».
**19.40** Меладрама «Каханне з акцэнтам».
**23.00** Камедыя «Ракавая Лара».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.00, 4.40** «Доктар І...»
**8.30, 19.05, 0.55** «Дзе мая дачка». Серыял.
**9.50, 3.00** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.40, 3.45** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.40** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.35** «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
**13.30, 18.00** «Пятая варта». Серыял.
**14.30** «Псіхасаматыка».
**15.05** «Рокіно».
**15.20, 2.15** «Нераскрытыя тайны».
**16.15** «Мой герой».
**17.05, 21.40** «Каханне са зброяй». Серыял.
**20.45, 0.10** «Ланцуг». Серыял.
**22.35, 5.10** «Зоркі і містыка».
**23.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.00** М/ф «Воблачна, магчымыя ападкі ў выглядзе фрыкадэлек».
**8.00** Камедыя «28 дзён».
**10.00** Драма «Я — Сэм».
**12.10** Камедыя «Бі і крычы».
**14.00** Драма «Магія слоў: Гісторыя Дж.К. Роўлінг».
**16.00** Драма «Хлусня дзеля выратавання».
**18.00** Фэнтэзі «Прылады смерці: Горад касцей».
**20.05** Фантастыка «Пасвячоны».
**22.00** Меладрама «Цяжкасці перакладу».
**0.00** Фэнтэзі «Іншы свет: Паўстанне ліканаў».
**2.00** Драма «Мой анёл-ахоўнік».
**4.00** Драма «Лофт».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 16.20** Меладрама «Вечнае вяртанне».
**8.20, 2.20** Драма «Іван сын Аміра».
**10.25** Камедыя «Адно каханне на мільён».
**12.20** Прыгоды «Вязень замка Іф. Граф Монтэ-Крыста».
**14.20** Мюзікл «Папса».
**18.20** Баявік «Дзень Д».
**20.20** Камедыя «Хлопец з нашых могілак».
**22.20** Драма «Бумеранг».
**0.20** Драма «Клас карэкцыі».
**4.25** Камедыя «Адно каханне на мільён».

### National Geographic

**6.00, 7.35, 13.10, 17.50, 21.00, 0.55, 4.00, 5.35** Гульні розуму.
**6.50** Папулярная навука.
**7.10** Займальная навука.
**8.20, 18.40, 21.45, 1.40, 4.50** Шырокі погляд.
**9.10, 14.00, 19.30** Злавіць кантрабандыста.
**10.00, 14.45, 20.10, 0.10, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**10.45** Дзікі тунец.
**11.35** Шаша праз пекла.
**12.20** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**15.30** Па слядах міфічных пачвар.
**16.20** Сіла плямені.
**17.05** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**22.35** Код небяспекі.
**22.55** Навуковыя недарэчнасці.
**23.20, 2.30** Эвакуацыя Зямлі.

### Discovery

**8.00, 12.30, 22.00** Хуткія і гучныя.
**8.50** Што было далей?
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Багажныя войны.
**11.35, 7.10** Драпежнікі буйным планам.
**13.25, 6.25** Забойныя дылемы.
**15.15, 1.00, 5.35** Легендарны аўтамабіль.
**16.10, 3.00** Махінатары.
**18.00** Бітва з акіянам.
**19.00** Зорнае выжыванне.
**20.00** Востраў з Беарам Грылсам.
**23.00** У пагоні за класікай.
**0.00** Вулічныя гонкі.
**2.00. 4.50** Бітва за нерухомасць.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.

■ Сядзі і глядзі

## АД ФРЫСТАЙЛА ДА ФУТБОЛА

Канал «Беларусь 5» плануе паказаць сёлета найбольш папулярныя сусветныя і еўрапейскія спартыўныя спаборніцтвы.

**Ужо 20 лютага ў «Раўбічах» распачнецца этап Кубка свету па фрыстайле, які, як паведамілі ў прэс-службе Белтэлерадыёкампаніі, абавязкова будзе паказаны на тэлеэкранах. Тым, хто не здолее патрапіць на трыбуны, будзе каго падтрымаць і перад тэлевізарам. Напрыклад, таго ж Максіма Гусціка, які перамагаў у акрабатыцы на адным з заключных этапаў 2015 года.**



Буйныя вясновыя трансляцыі спартыўны канал распачне паказам чэмпіянату свету па біятлоне, які з 3 па 13 сакавіка пройдзе ў нарвежскім Халменколене. У красавіку «Чыжоўка-Арэна» прыме чэмпіянат свету сярод 18-гадовых хакеістаў у Дывізіёне І. А ў маі ў Санкт-Пецярбургу — планетарнае хакейнае першынство. Паядынкі абодвух турніраў пакажуць па Беларускім тэлебачанні. «Мы збіраемся паказаць усе матчы з удзелам нашай зборнай і плэй-оф у поўным аб'ёме, — кажа **Аляксандр КАЗЮКЕВІЧ, кіраўнік канала «Беларусь 5».** — Плануем, што гульні зборнай Беларусі будуць ісці на галоўным тэлеканале краіны. На другім сфарміруем пакет з паядынкамі расійскай зборнай, што традыцыйна выклікаюць у нашых гледачоў вялікі інтарэс. А на «Беларусь 5» пакажуць астатнія сустрэчы. На мой погляд, мы не маем права не паказаць матч, напрыклад, Канада—ЗША. Безумоўна, у Маскве і Санкт-Пецярбургу будуць працаваць наша група. Таму трэба чакаць у тым ліку эксклюзіў».

Гэтае лета — цуд для футбольных гурманаў. З 10 чэрвеня па 10 ліпеня ў Францыі пройдзе чэмпіянат Еўропы, і «Беларусь 5» пастараецца паказаць усе матчы першынства, агляды. У студыю будуць запрашаць экспертаў. Што цікава, да кантынентальнага турніру на канале ўжо пачалі рыхтавацца. У эфір выйшаў першы з дванаццаці 26-хвілінных дзённікаў "Па дарозе да EURO».

Ну а ў жніўні, з 5-га па 21-га, у Рыа-дэ-Жанейра адбудуцца галоўныя спартыўныя старты года — Алімпійскія гульні, на якіх разыграюць рэкордную колькасць камплектаў узнагарод — 306 медалёў. «Беларусь 5» будзе асвятляць Алімпіяду ў поўным аб'ёме. «Гледачы ўбачаць начныя трансляцыі ў прамым эфіры, — кажа Аляксандр Казюкевіч. — А затым днём у паўторы, калі ў Бразіліі будзе ноч. За выключэннем рэдкіх другіх трансляцый — усё-такі ў жніўні настане пара вырашальных матчаў кваліфікацыі футбольных еўракубкаў. Мяркую, у гэтым выпадку таксама будуць задзейнічаны іншыя каналы нашай кампаніі. Вяшчанне Гульняў кожны дзень будзе пачынацца з 15:00 і працягнецца да шасці гадзін раніцы».

Якаў ЖУРБІН.
taras@zviazda.by
■

## Серада, 10 лютага

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.20** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на пачатак Вялікага Посту. Попельная серада.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**10.50 Серыял «Простае жыццё».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.25** Дзень у вялікім горадзе.
**14.25** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Пастка».**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.20, 23.35** Сфера інтарэсаў.
**20.00, 0.25 Серыял «Снайпер. Зброя адплаты». 1-я серыя.**
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.10** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 17.25** «Вайна нявест». Рэаліці-шоу.
**9.40, 20.00** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**10.40, 16.20 Трылер «Закрытая школа».**
**11.45, 21.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**12.45, 17.55 Серыял «Вароніны».**
**13.50, 22.10, 23.55** Скетчком «Рыжыя».
**14.20, 19.00 Серыял «Кухня».**
**15.30, 23.05** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**0.25 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

### Беларусь 3

**7.20** М/ф.
**8.00, 12.40, 18.35, 0.15** «Калейдаскоп».
**8.15** «Гісторыя Беларусі».
**8.20, 12.55** «Размовы пра духоўнае».
**8.30 «Людзі на балоце. Палеская хроніка». Кінаэпапея. «Калядныя маразы».**
**9.35** «Святыні Беларусі». Спаса-Праабражэнскі храм святой прападобнай Еўфрасінні Полацкай.
**10.05 «Чырвоныя званы». Маст. фільм. «Мексіка ў агні».**
**12.15** «Свята далёкай зоркі». Памяці народнага артыста Беларусі Сяргея Жураўля.
**13.05** «Барыс Пастарнак. Выбар шляху». Дак. фільм.
**13.35 «Федра». Драма.**
**15.25** Творчы вечар народнага артыста СССР Уладзіміра Зельдзіна.
**16.40 «Свінарка і пастух». Меладрама.**
**18.05, 23.50** «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
**18.50, 21.00** «Адваротны бок Месяца». Дак. фільм. «Першы фізік Расіі».
**19.35 «Людзі на балоце. Палеская хроніка». Кінаэпапея. «Дні надзей».**
**20.40** «Калыханка».
**21.40 «Чырвоныя званы». Маст. фільм. «Я бачыў нараджэнне новага свету».**

### Беларусь 5

**6.20, 18.50, 23.05** PRO спорт. Навіны.
**6.30, 23.15** Баскетбол. НБА. «Голдэн Стэйт» — «Х'юстан».
**8.50** Хакей. Ліга чэмпіёнаў. Фінал. «Кярпят» (Фінляндыя) — «Фрэлунда» (Швецыя).
**11.00, 20.35** Тэніс. Турнір WTA. Санкт-Пецярбург.
**15.00** Спорт-кадр.
**15.30** Біятлон. Этап Кубка свету. Кэнмор. Супермікс.
**16.30** Біятлон. Этап Кубка свету. Кэнмор. Змяшаная эстафета.
**18.00** «Спорт, спорт, спорт». Ганна Бацюшка.
**18.30** Козел пра футбол.
**18.55** Гандбол. Чэмпіянат Беларусі. СКА-Мінск — ГК «Гомель».
**22.35** Слэм-данк.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.35** «Бесталковыя нататкі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05** «Час пакажа».
**16.20** «Таблетка».
**17.00** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Метад Фрэйда 2».**
**22.55 Баявік «Недатыкальныя».**
**0.55** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** Баявік «Атрад выратавання».
**10.00** «Далёкія сваякі».
**10.40, 17.35** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**14.10, 23.00 «Знахар». Серыял.**
**15.55** «Ведай нашых!»
**16.50** «Мінск і мінчане».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Камедыя «Ас з асаў».**

### МІР

**22.00** «Глядзець усім!»
**0.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Медыцынская праўда».
**9.30, 1.05 Маст. фільм «Водпуск, які не адбыўся».**
**11.05 Маст. фільм «Спартак і Калашнікаў».**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Вой, матулечкі!»
**13.45, 2.30 Серыял «Школа выжывання ад адзінокай жанчыны з трыма дзецьмі ва ўмовах крызісу».**
**14.15, 20.05 Серыял «Развод».**
**15.00, 3.55** «Справы сямейныя».
**16.20** «Сакрэтныя матэрыялы».
**16.50, 3.30** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**17.20, 19.20 Серыял «Дзяжурны анёл».**
**21.05 Маст. фільм «Рэтрум».**
**23.00 Серыял «Кароткі курс шчаслівага жыцця».**
**23.55** Галоўная тэма.
**0.10** Ток-шоу «Слова за слова».
**3.00** Дак.серыял «Іншы свет».
**4.20 Маст. фільм «Вясёлая моладзь».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 23.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.25** «Шыфры нашага цела. Невядомыя органы». «Смяротныя доследы. Генетыка».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Каменская».**
**19.10, 20.55 Серыял «Земскі доктар».**
**22.00, 23.10 Серыял «Сонца ў падарунак».**
**23.50** «Спецыяльны карэспандэнт».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10 Серыял «Хвост».**
**7.10** «Ты не паверыш!»
**8.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**9.00 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Свята і цень маяка».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25, 21.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.10 Серыял «Браценікі».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**20.00 Серыял «Пчаляр».**
**22.00** «Вынікі дня».
**22.30 Серыял «Чалавек без мінулага».**
**0.15 Серыял «Глухар. Працяг».**

### 8 канал

**7.00, 14.10, 19.45, 21.00, 23.55** Надвор'е.
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 20.50 Серыял «Песня лёду і полымя».**
**8.25, 9.30, 12.45, 13.55, 15.45, 16.30, 18.00, 19.40, 20.55** Хатняя крама».
**8.30, 18.10 Серыял «Каханне імператрыцы».**
**9.35** Дак. серыял «Іерогліф сяброўства».
**10.15** «Кінаблакнот».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Трылер «Фарсаж».**
**13.00 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
**14.15 Серыял «Каханне і страх».**
**16.45 Серыял «Доўгая дарога ў дзюнах».**
**19.10** «Мой любімы гадаванец».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Драма «72 метры».**
**23.10 Серыял «У пустыні смерці».**

### ВТБ

**6.00, 17.00, 0.00** «Лаві момант».
**6.30, 23.10, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** М/ф «Пінгвіняня Параро».
**8.00, 13.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00, 23.30** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**9.30, 14.00, 19.00** Серыял «Васьмідзясятыя 5».
**10.30, 15.00, 20.00** Серыял «Маладзёжка 3».
**11.30** Камедыя «Змяшаныя пачуцці».
**16.00, 5.00** «Турбаміксер».
**17.30, 0.30, 4.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**21.10** Камедыя «Лары Краўн».
**1.00, 3.30** «Дурні і дарогі».
**1.30** Серыял «Нямы сведка».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Наглядальнік».
**11.15, 0.20** Дзень памяці А.С. Пушкіна. «Апошняя дарога». Маст. фільм.
**12.50** Важныя рэчы. «Кій А.С. Пушкіна».
**13.05** «Красуйся, горад Пятроў!» «Вялікі палац у Пецяргофе».
**13.35, 20.45** «Правілы жыцця».
**14.00** «Фантастычнае падарожжа ў свет нанамедыцыны». Дак. фільм.
**14.50** «Неферціці». Дак. фільм.
**15.10, 23.45** Выдатныя дзеячы культуры. Юрый Лотман. «Пушкін і яго асяроддзе». «Граф Фёдар Талстой-Амерыканец».
**15.50, 22.55** «Рассакрэчаная гісторыя». Дак. серыял.
**16.20** Штучны адбор.
**17.05** Замежная справа. «Гаспадыня Еўропа».
**17.45** Майстры фартэпіяннага мастацтва. Фрэдэрык Кэмпф.
**18.45** «Рэгтайм, або Разарваны час». «Лекцыя для дурня».
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Абсалютны слых».
**21.10** Навука без межаў. «Уся справа ў генетыцы?» Дак. фільм.
**22.10** Улада факта. «Арктычныя шлях Расіі».
**23.40** Мастсавет.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Міцькі». Дзмітрый Шагін, Канстанцін Батынкоў. 2005 год.
**6.55, 830, 9.40, 11.00, 13.05, 14.30, 15.40, 17.00, 18.55, 20.20, 21.40, 23.00, 0.45, 1.55, 3.40, 5.20** Музычная настальгія.
**7.10** Маст. фільм «Блакітныя маланкі».
**8.45, 14.45, 20.45** Кінačасопіс «Хачу ўсё ведаць!».
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Тэлебачанне Перабудовы: праграма «Погляд». 2006 год.
**13.20** Маст. фільм «Кожны вечар пасля працы».
**18.00** «Яловая субмарына». «Гісторыя рускага рока». «Акварыум». «Мы ніколі не станем старэйшымі». 1-я частка. 2007 год.
**19.10** Маст. фільм «Напярэдадні прэм'еры».
**0.00** «Акулы пяра». Мікалай Наскоў і гурт «Мікалай».
**1.30** Маст. фільм «Ля мора, дзе мы гулялі».
**2.30** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...». Булат Акуджава.
**4.00** Маст. фільм «Алеся».

### EuroSport 1

**3.00, 7.00, 12.00** Футзала. Чэмпіянат Еўропы.
**3.30, 6.00, 9.30, 14.00, 18.00, 23.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**4.30, 16.00, 22.00, 2.30** Біятлон. Кубак свету.
**5.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны.
**9.00, 11.15** Watts.
**10.30** Аўта- і мотаспорт. Акадэмія GT.
**11.30, 11.55** Футбол. Еўрагалы.
**11.35** Футбол. Яго Вялікасць футбол.
**14.45, 17.00** Лыжнае дваябор'е. Кубак свету.
**20.45, 1.00** Снукер. «Мастэрс». Фінал.

### Камедыя

**0.55** Камедыя «Гамбіт».
**2.25** Камедыя «Сёння ў меню».
**4.05** Камедыя «Нешта падобнае на шчасце».
**5.40, 21.25** Меладрама «Нявеста з таго свету».
**7.15** Меладрама «Каханне з перашкодамі».
**9.05** Камедыя «Дзікая штучка».
**10.45** Камедыя «Матулі».
**12.25** Камедыя «Карсіканец».
**14.00, 14.50, 15.40, 17.45** Скетчком «Паміж намі».
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Меладрама «Каханне з акцэнтам».
**18.00** Меладрама «Красуні».
**19.40** Камедыя «І не чырванее».
**23.05** Меладрама «Поспехаў, Чак».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.05, 4.45** «Доктар І...»
**8.35, 19.00, 0.55** «Дзе мая дачка». Серыял.
**9.55, 3.10** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.45, 3.55** «Па справах непаўналетніх». Дак. серыял.
**11.45** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.40** «Жыццё як жыццё». Дак. серыял.
**13.35, 17.55** «Пятая варта». Серыял.
**14.30** «Псіхасаматыка».
**15.05, 2.25** «Нераскрытыя тайны».
**16.05** «Мой герой».
**16.55, 21.45** «Каханне са зброяй». Серыял.
**20.50, 0.10** «Ланцуг». Серыял. Заключная серыя.
**22.35, 5.10** «Зоркі і містыка».
**23.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.00** Драма «Магія слоў: Гісторыя Дж. К. Роўлінг».
**8.00** Драма «Я — Сэм».
**10.10** Камедыя «Сцюарт Літл».
**12.00** Меладрама «Якія не спяць у Сіэтле».
**14.00** Драма «Маленькія жанчыны».
**16.00** Фантастыка «Пасвячоны».
**18.00** Драма «Залатое стагоддзе».
**20.00** Меладрама «Еш, маліся, кахай».
**22.15** Драма «Мой анёл-ахоўнік».
**0.10** Драма «Лофт».
**2.00** Меладрама «Яшчэ адна з роду Балейн».
**4.00** Драма «Гангстар».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.10** Драма «ФРАНЦ+ ПАЛІНА».
**8.30, 2.20** Камедыя «Хлопец з нашых магілак».
**10.20, 4.20** Драма «Бумеранг».
**12.20** Прыгоды «Вязень замка Іф. Аз вам».
**14.10** Драма «Іван сын Аміра».
**16.15** Камедыя «Адно каханне на мільён».
**20.20** Камедыя «Спакаванныя».
**22.20** Драма «Іншае неба».
**0.20** Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Касцюм Арлекіна».

### National Geographic

**6.00, 9.10, 13.10, 19.30, 5.35** Гульні розуму.
**6.50** Папулярная навука.
**7.10** Займальная навука.
**7.35, 17,50** Ледзяная дарога.
**8.20, 18.40** Непакорлівы востраў.
**10.00, 14.45, 20.10** Шырокі погляд.
**10.45** Дзікі тунец.
**11.35** Шаша праз пекла.
**12.20** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**15.30** Па слядах міфічных пачвар.
**16.20** Сіла племені.
**17.05** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**21.00, 0.55, 4.00** Аўта-SOS.
**21.45, 1.40, 4.50** Сапраўдны суперкар.
**22.35** Код небяспекі.
**22.55** Навуковыя недарэчнасці.
**23.20, 2.30** Эвакуацыя Зямлі.
**0.10, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.

### Discovery

**8.00, 12.30** Легендарны аўтамабіль.
**8.50** Забойныя дылемы.
**9.45, 14.20, 21.30** Як гэта ўстроена?
**10.10, 14.45, 21.00** Як гэта зроблена?
**10.40, 17.05** Бітва за нерухомасць.
**11.35, 7.10** У пошуках скарбаў.
**13.25, 6.25** І зноў не спрабуйце паўтараць.
**15.15, 5.35** Кубінскі хром.
**16.10, 3.00** Махінатары.
**18.00** Вулічныя гонкі.
**19.00** Хуткія і гучныя.
**20.00** У пагоні за класікай.
**22.00** Паляўнічыя на зброю.
**23.00** Паляўнічыя на старызну.
**0.00** Ліквідатар.
**1.00** Багажныя войны.
**2.00, 4.50** Паляўнічыя на рэліквіі.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**04.25** Сапраўдныя аферысты.

## Гараскоп на



**АВЕН.** У гэтыя дні ў вас вельмі высокі энергетычны патэнцыял, але выкарыстаць яго з карысцю наўрад ці атрымаецца. Таму давядзецца расходаваць лішак энергіі любымі даступнымі спосабамі. Будзе вялікае жаданне запусціць нейкі новы працэс, але вынікі гэтага дзеяння будуць сумныя. Найлепшае выйсце — заняць сябе чым-небудзь не вельмі сур'ёзным і значным, напрыклад спортам ці навядзеннем парадку дома. Гэта добры перыяд для наладжвання адносін, як унутры сям'і, так і з сябрамі.



**ЦЯЛЕЦ.** Пачатак тыдня будзе ўтомны, бо ад вас спатрэбіцца падцягнуць усе хвасты і завяршыць пачатае, ці хоць бы давесці да нейкага лагічнага этапу. Але сіл у вас хопіць не толькі на гэта, іх будзе шмат, што дазволіць заняцца многім адначасова і ўсюды атрымаць поспех. У вас могуць з'явіцца новыя напрамкі ў дзейнасці, якія абяцаюць быць перспектыўнымі. У другой палове тыдня не выключаны падарожжа і грашовыя паступленні. Гэты час асабліва спрыяльны для рамантычных і сямейных адносін. Павышаецца эмацыянальнасць, жаданне моцных і яркіх пачуццяў.



**БЛІЗНЯТЫ.** Поспех чакае старанных і адказных людзей. Сцеражыцеся падману ў пачатку тыдня, асабліва гэта можа тычыцца грошай і абяцанняў штонебудзь зрабіць. Разлічвайце толькі на свае сілы і прытрымлівайцеся плана, не імкніцеся зрабіць нешта хутчэй, пераскласці абавязкі ці іншым чынам змяніць ход падзей, бо гэта можа выклікаць адваротны вынік. Спроба сэканоміць гэтак жа можа выйсці вам бокам. У канцы тыдня вас чакае досыць радасны і прыемны момант. Магчыма, гэта будзе свята ці іншае мерапрыемства, якое дазволіць напоўніцу атрымаць асалоду ад жыцця.



**РАК.** На гэтым тыдні найбольш ярка праявіць сябе рамантычны бок жыцця. У пачатку тыдня вы будзеце схільныя да флірту і новых знаёмстваў. А затым ваша эмацыянальнасць прыме больш выразныя рамкі, што дазволіць завесці сур'ёзныя адносіны або дадаць новых нотак у наяўныя. Могуць нагадаць пра сябе нейкія старыя сувязі і праблемы, якія вы не завяршылі ў мінулым. Другая палова тыдня прадвесціць утомную працу дзеля дасягнення нядаўна пастаўленых жыццёвых мэтаў.



**ЛЕЎ.** Давядзецца зноў праявіць свае лідарскія здольнасці і ўменне адказваць за самога сябе і зроблены выбар. Справа ў тым, што на гэтым тыдні вам трэба будзе выбіраць, і ад гэтага будзе залежаць далейшы кірунак дзейнасці. У рэдкіх выпадках гэты выбар закране адносіны (для тых, хто знаходзіцца ў складанай сітуацыі), у асноўным жа гэта праявіць сябе на працы ці ў бізнесе. Перад вамі адкрываюцца новыя магчымасці, але трэба не баяцца і пачаць рухацца наперад насустрач поспеху.



**ДЗЕВА.** У матэрыяльным плане намячаецца стабільнасць. Вы будзеце трывала стаяць на нагах. Не выключаны і непасрэдна фінансавыя паступленні, але толькі заслужаныя — гэта не час выпадковасцяў ці неабгрунтаванага поспеху. І хоць вялікая колькасць спраў выкліча ў вас стомленасць і напрыканцы тыдня ні на што іншае сіл не застанецца, тым не менш мэта будзе дасягнута, і вы атрымаеце тое, на што разлічвалі.

■ Кінагід

# МЮРЭЙ СУРКАМ НЕ СПАДАБАЎСЯ

**Дзень сурка — народнае метэаралагічнае свята не толькі ў ЗША, але і ў Канадзе. Яго карані ідуць ад старажытнарымскага свята, Дня вожыка, які таксама адзначаўся 2 лютага. У шэрагу краін ён вядомы як Дзень барсука ці Дзень мядзведзя. Самы вядомы фільм пра гэтую падзею — амерыканскі «Дзень сурка» з Білам Мюрэем і Эндзі Макдаўэл у галоўных ролях. Прапануем вам крыху малавядомых і пацешных фактаў з гісторыі яго стварэння.**

Вядуцца гарачыя дыскусіі пра тое, колькі ж часу правёў Філ у пятлі часу. Рэжысёр Гаральд Раміс успамінаў, што, як меркавалася першапачаткова, герою трэба было прабыць у другім лютым 10 000 гадоў! Але ў выніку сышліся на дзясятку. Фанаты фільма падлічылі, што нібыта прайшло 8 гадоў, 8 месяцаў і 16 дзён. Але ёсць і іншая методыка, па якой спецыялісты налічылі 34 гады — менавіта столькі спатрэбілася б герою, каб стаць экспертам у гульні на піяніна, высечцы скульптур, медычнай практыцы і гэтак далей.

Суркі ўсё ж пакусалі Біла Мюрэя, прычым двойчы, так што акцёру ставілі прышчэпкі супраць шаленства.

Рэжысёр адмовіўся аддаць галоўную ролю Тому Хэнксу, бо палічыў яго занадта мілым. Прыкладна тое ж было сказана Чэві Чэйзу, Стыву Марціну і Джону Траволту.

У СССР за шэсць гадоў да «Дня сурка» было знятае кіно з вельмі блізкай ідэяй — аб двух таварышах, якія трапляюць у 8 мая 1949 года і захрасаюць там надоўга. Гэта вядомы фільм Уладзіміра Хаціненкі «Люстэрка для героя».



У Галівудзе ў тым жа годзе, што і «Дзень сурка», выйшла яшчэ адна неверагодна падобная паводле сюжэта карціна «12:01». Падабенства і паралелі з «днём» былі настолькі відавочныя, што аўтары «12:01» спрабавалі ў судзе даказаць, што іх ідэю ўкралі.

У першапачатковым сцэнарыі дэталёва прапісваецца перадгісторыя — чаму ж менавіта Філ апынуўся ў Дні сурка. Меркавалася, што ў галоўнага героя была сяброўка, якая разззлавалася на яго, купіла кнігу пра магію, сказала нейкае заклінанне, спаліла нешта і разбіла малатком наручны гадзіннік Філа.

Першапачаткова фільм не абяцаў быць смешным, ён задумваўся больш як драма, а бліжэй да канца Філу належала забіць сурка ў нары. Таксама меркаваўся альтэрнатыўны фінал, дзе Філ прачынаецца 3 лютага, але ў гэты момант Рыта трапляе ў сваю часавую пятлю.

Бістро «Тып Топ», дзе адбываецца істотная частка падзей, не існавала ў рэальнасці ні ў Пунксатоні, ні ў Вудстаку (дзе здымалася кіно), яно было створана як дэкарацыя. Мясцовым жыхарам настолькі ўстанова прыйшлася даспадобы, што пасля здымак макет ператварылі ў рэальную кавярню.

Найбольш пакут рэжысёру даставіла фінальная сцэна абуджэння. Было знята 25 розных дубляў, дзе Філ прачынаецца з Рытай, але ніхто так і не мог зразумець, які ж настрой павінен быць паказаны ў такім момансе. Таксама было важным вызначыцца — прачынаюцца яны ў бялізне або без, як пасля сексу. У выніку Раміс правёў скрупулёзнае апытанне ўсёй здымачнай каманды, аж да асвятляльнікаў — якім яны хочуць бачыць гэты эпізод. Фінальнае галасаванне вырашыла пытанне на карысць апранутых герояў.

## Нядзеля, 14 лютага

### Беларусь 1

**7.20 Меладрама «Праверка на каханне».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40, 0.35 Серыял «Два бацькі і два сыны».**
**10.15** «50 рэцэптаў першага».
**11.10** Гісторыі рамонту.
**11.45** Нашы.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Каробка перадач.
**13.10** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**13.40** Тайны следства.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Твой горад.
**15.30 Меладрама «Букет».**
**17.20 Меладрама «Бясцэннае каханне».**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Клуб рэдактараў.
**22.35** Навіны надвор'я.
**22.55 Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць».**

### Беларусь 2

**6.50** Вось гэта дзіва!
**7.15** Зразумець і абясшкодзіць.
**7.45, 20.05** Тэлебарометр.
**7.50** «Вулічная магія». Рэаліці-шоу.
**8.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**10.15** «Арол і Рэшка. Шопінг».
**11.20** Ваша лата, Пяцёрачка.
**12.00** Анімацыйны фільм «Монстры на востраве».
**13.35 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**15.30 Камедыя «Голая праўда».**
**17.20 Камедыя «50 першых пацалункаў».**
**19.15** Суперлато.
**20.40** Кіпень.
**21.10** «Панаехалі». Рэаліці-шоу.
**22.05** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.25** Хачу ў тэлевізар!
**22.30 Серыял «Косці».**

### Беларусь 3

**8.00, 21.55 «Нестар Бурма». Серыял (заключная серыя).**
**9.30** «Подых струн». Музычная праграма. Госці: Андрэй Карповіч, Сціў і Ганна Крамер, Андрэй Маркуц.
**10.10** «Наперад у мінулае».
**10.35** Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
**11.30** «Музеі Беларусі». Філіялы Мазырскага аб'яднанага краязнаўчага музея: «Палеская веда», «Выставачная зала», «Музей-майстэрня Міхала Пушкара».
**11.55 «Дзень святога Валянціна». Камедыя.**



**13.00** «Мой бацька — Юрый Цвяткоў». Дак. фільм.
**13.55 «Канец атамана». Драма.**
**16.15** «Кіно і час». Рудабельская рэспубліка.
**16.55 «Служылі два таварышы». Драма.**
**18.30 «Кін-дза-дза». Камедыя.**
**20.40** «Калыханка».
**21.00** Канцэрт ансамбля «Сябры».
**23.25** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя тайны». «Адна ноч і ўсё жыццё. Марыя Спірыдонава». Дак. фільм.

### Беларусь 5

**7.05, 21.40** PRO спорт. Навіны.
**7.15** Тэніс. Турнір WTA. Санкт-Пецярбург. 1/2 фіналу.
**9.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Чэлсі» — «Ньюкасл».
**11.35** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Лестэр».
**13.30** Гандбол. Кубак ЕГФ. СКА (Мінск, Беларусь) — «Вінтэртур» (Швейцарыя).
**14.55** Біятлон. Этап Кубка свету. Прэск-Айл. Эстафета. Мужчыны.
**16.30** Тэніс. Турнір WTA. Санкт-Пецярбург. Фінал.
**18.30** «Місія Рыа-2016». Відэачасопіс.
**19.00** Авертайм.
**19.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**20.00** Біятлон. Этап Кубка свету. Прэск-Айл. Эстафета. Жанчыны.
